Аўтар: Баюрава Валерыя Паўлаўна,
вучаніца XI класа
ДУА “Сярэдняя школа № 45 г. Магілёва”
(настаўнік – Лунькова Вольга Пятроўна)

# ШТО ТАКОЕ АДЗІНСТВА?

“Адзін за ўсіх – і ўсе за аднаго”, - такі няпісаны кодэкс мушкецёраў перажыў ужо стагоддзі. І я ўпэўнена, што жыць яму яшчэ доўга-доўга. А ўсё чаму? Ды таму, што скіраваны быў на жыццё разам, у адзінстве і згодзе. Таму, што жыццёвая мудрасць падказвала: так лягчэй і спакайней, калі плячо ў плячо, калі гора на ўсіх – паўгора, а шчасце – шчасце ўдвая. Так было, так ёсць, і так заўсёды будзе. Не верыце? Зараз па парадку ўсё раскажу, думку сваю грунтоўна дакажу. Беларусь у прыклад прывяду. Пакажу, што народ беларускі з мушкецёрамі можна параўнаць.

Беларусь. Якая яна? Шматнацыянальная, шматаблічная, шматрэлігійная… А яшчэ шматпакутная. Колькі выпрабаванняў і перашкод выпала на яе долю! І заўсёды мая Радзіма пераможцай была, бо бараніцца ад ворага ўмела, правы адстойвала свае, каб мір і шчасце былі на зямлі. Бараніцца ўмела, а вось захопніцай ніколі не была. А ўсё чаму? Ды таму, што мудрасць векавую перадавала свята народа сваёй зямлі. Вучыла дзяцей з калыскі, што цяжкасці лёгка агараць талакой. Вучыла з суседзямі жыць у павазе і згодзе, не тоячы думкі свае, – і ведала вёска ад краю да краю, што робіцца ў кожным доме яе жыхароў. Вучыла думкам чыстым, душы адкрытай, сэрцу неабыякаваму – і агеньчык на акне дарогу падказваў падарожнаму, а дзверы незачыненыя з хлебам, пакінутым гаспадарамі на стале, ад смерці галоднай падарожнага ратавалі. Ці не доказ гэта таго, што адной сям’ёй людзі жылі, аднымі думкамі звязаны былі?

Сям’я плюс сям’я – род.
Род плюс род – народ.
Народ плюс народ – людзі Зямлі…

Людзі Зямлі Беларускай! Якія яны? Працавітыя і гасцінныя, мудрыя і таленавітыя, талерантныя і надзейныя… Як мушкецёры – смелыя! Згодна кодэкса сумлення жылі! Адзін за аднаго гарой стаялі! І ўсе разам аднаго з бяды выручыць маглі. І гэты няпісаны кодэкс з пакалення ў пакаленне перадалі.

Узяць да прыкладу перыяд гісторыі цяжкі, калі Беларусь разрэзалі па-жывому, падзяліўшы на Заходнюю і Усходнюю. І гэта амаль на 20 гадоў. Ці можна так рабіць было??? А пра людзей падумаў хто? І самі сабе дапамаглі людзі Беларускай Зямлі. Усходняя Беларусь братам дапамагла, бо змірыцца не магла, што ў ярме жывуць сябры і сваякі. А іначай як? Заўсёды разам да гэтага былі – і раптам рану такую пабачылі на целе Беларусі-Зямлі. Доўга сілы збіралі браты-землякі, кроплю да кроплі цярпенне складалі ў адно – верасень настаў, апошнімі восеньскімі кветкамі брат-зямляк брата-земляка вітаў. І кодэкс мушкецёраў зноў спрацаваў: “Адзін за ўсіх – усе за аднаго”. А калі б не прывыклі змалку разам жыць? Калі б Беларусь мудрасці не навучыла? Калі

б маці з калыскі ў калыханках любові да брата і сябра не навучылі? Добра, што не было гэтага “калі б” у народа майго.

А што было? Выпрабаванні, выпрабаванні… І самая жорсткая, самая апошняя, самая крывавая і бязлітасная Вялікая Айчынная вайна. І зноў з’яднацца давялося, каб ворага нага ступіць не смела на беларускі парог. Вытрымалі, перамаглі, бо разам былі, разам на смерць стаялі, разам елі і спалі, разам Перамогу чакалі. Чужых не было – усе сваімі былі, кавалак апошні дзялілі, як маглі. Беларускую зямлю разам з руін узнялі – прыгажосцю сваёй і ўтульнасцю і зараз здзіўляе краіны ўсе! Разам змаглі!

І святы святкавалі з песнямі і танцамі, гульнямі і забавамі, гармонік запрашаючы да працы. Весела жылі? Сярод выпрабаванняў суровых і кровапраліццяў на зямлі? Усякае было: гора гаравалі разам, маленькую радасць памнажалі разам, таму і пра вяселле не забывалі. Умелі змагацца і годна паміраць, умелі адзін аднаму дапамагаць, умелі і песні спяваць – так выжыць лягчэй было. Пра колькасць гаворку не вялі – на дапамогу аднаму гуртам ішлі. А той адзін за ўвесь гурт сваімі аднымі грудзьмі дзот прыкрываў, каб гурту дарогу да перамогі адкрыць.

А Чарнобыль? Усе разам, адным строем усталі беларусы на абарону Радзімы ад чорнага зла. Усталі, каб чарнобылем не парасла зямля, каб сярод лясоў і кветкавых палян паветра чыстым засталося. Не ўсё зрабіць змаглі: плямы чорнай смерці там-сям ляглі. А калі б разам не былі? Плямы чорнай смерці тады б паўсюль ляглі.

Ці складана гэта: адзін за ўсіх і ўсе за аднаго? Для майго народа – адназначна, не! Выхаваныя Зямлёй Беларускай, ускормленыя матчыным малаком з векавымі традыцыямі пакаленняў, мае землякі ўсе перашкоды пераадолець маглі. І гэту сілу кожнаму беларусу перадалі. А яшчэ закон існавання вывелі: У адзінстве жыць – шчаслівым быць! Па пруціках і венік лёгка зламаць!

І я ўсё думаю: а што, каб разам не былі? Напэўна, нічога б не змаглі! І тады… Няхай ніколі не будзе гэтага “тады” ў маёй зямлі.

Значыць, працуе няпісаны кодэкс мушкецёраў: адзін за ўсіх – і ўсё за аднаго! І ў гэтым паратунак маёй Зямлі!